Н.Р. Маўлютава

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## Праверачныя і кантрольныя работы

## 3 клас




ЭКОПЕРСПЕКТИВА

УДК 811.161.3(075.2=161.3=161.1)
ББК 81.2Бел-922
М35

**Маўлютава, Н.Р.**

М35 Беларуская мова : 3-ці кл. : праверачныя і кантрольныя работы : дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Н.Р. Маўлютава. – Мінск : Экаперспектыва, 2022. – 52 с.

ISBN 978-985-469-888-5.

Сістэматычны ўлік ведаў, уменняў і навыкаў вучняў з'яўляецца неад'емнай часткай арганізацыі навучальнага працэсу ў пачатковай школе. Змешчаны ў дапаможніку матэрыял можна выкарыстоўваць не толькі для кантролю за вучэбнымі дасягненнямі вучняў, але і для абагульнення і сістэматызацыі ведаў вучняў па асноўных тэмах, вывучаемых у 3-м класе. Праца са сшыткам дапамагае арганізаваць індывідуальную работу з вучнямі на ўроку і самастойную работу дома. Для гэтага ў дапаможніку змешчаны адказы, якія можна прагледзець з дапамогай QR-кодаў.

Адрасуецца вучням 3-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, настаўнікам і бацькам.

УДК 811.161.3(075.2=161.3=161.1)
ББК 81.2Бел-922

ISBN 978-985-469-888-5

© Маўлютава Н.Р., 2022
© Афармленне. УП «Экаперспектыва», 2022

Н.Р. Маўлютава

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА
## 3 клас

### Праверачныя і кантрольныя работы

*Дапаможнік для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання*

Мінск
«Экоперспектива»
2022

# ПРАДМОВА

Правядзенне бягучай і прамежкавай атэстацы з'яўляецца неад'емнай часткай арганізацыі навучальнага працэсу на першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Кантроль ведаў праводзіцца з мэтай праверкі і ацэнкі засваення вучэбнага матэрыялу пэўнай тэмы. Пры гэтым ацэньваюцца дасягненні вучняў не па асобных элементах (як пры паўрочным кантролі), а ў лагічнай сістэме, якая адпавядае структуры вучэбнай тэмы (тэм).

Змешчаны ў дапаможніку матэрыял (у 2-х варыянтах) можна выкарыстоўваць не толькі для праверкі ведаў, але і для абагульнення і сістэматызацыі ведаў вучняў па асноўным тэмах, вывучаемым у 3-м класе. Па кожнай тэме прапанавана сістэма заданняў, якая забяспечвае праверку якасці авалодання вучнямі неабходнага матэрыялу. Заданні з'яўляюцца сродкам дыягностыкі і самадыягностыкі ступені засваення кожным вучнем функцыянальных сродкаў беларускай мовы. Перад кожнай праверачнай работай прапанаваны матэрыял для актывізацыі ведаў вучняў па тэмах. Пасля выканання праверачнай работай прадугледжана работа над памылкамі, якая накіравана на карэкцыю ведаў вучняў.

У дапаможніку таксама змешчаны кантрольныя работы па тэмах «Сказ» «Склад слова», «Часціны мовы».

Ацэньванне работ праводзіцца згодна з нормамі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці. Заданні складзены ў адпаведнасці з патрабаваннямі праграмы па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і размеркаваны ў той жа паслядоўнасці, у якой ідзе вывучэнне тэм.

Неабходна адзначыць, што выкананне ўсіх работ гэтага дапаможніка не з'яўляецца абавязковым.

Праца са сшыткам спрыяе актывізацыі станоўчай матывацыі навучэнцаў, развіццю іх самастойнасці і ініцыятывы, аказвае дапамогу настаўніку ў павышэнні эфектыўнасці кантролю ведаў, уменняў і навыкаў, дапамагае арганізаваць індывідуальную работу з вучнямі на ўроку і самастойную работу дома. Для гэтага ў дапаможніку змешчаны адказы, якія можна прагледзець з дапамогай QR-кодаў.

**Правапіс слоў з літарамі *е*, *ё* — *я***

У беларускай мове ў першым складзе перад націскам замест літар *е*, *ё* пішацца літара *я* (цёплы — цяпло́, лес — лясні́к).

У запазычаных словах у першым складзе перад націскам пішацца літара *е* (метал, медаль, пенал, спектакль, секунда, аперацыя, герой, метро, мелодыя, балерына).

**Галосныя гукі пасля цвёрдых зычных. Іх абазначэнне на пісьме**

Зычныя *ж*, *ш*, *дж*, *ч*, *р*, *ц* — цвёрдыя. Пасля зацвярдзелых зычных пішуцца галосныя *а*, *о*, *у*, *ы*, *э* (джала, рэчка).

**Правапіс слоў з літарамі *о*, *э* — *а***

Літары *о*, *э* пішуцца толькі пад націскам (го́рад, рэ́кі, по́ле). Не пад націскам яны пераходзяць у *а* (гарады́, рака́, палі́).

**Напісанне слоў з *ў***

Літара *ў* пішацца пасля галосных літар у сярэдзіне і ў канцы слова (шпакоўня, аўтобус, спытаў).

Літара *ў* пішацца ў пачатку слова, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосную літару (Матуля Марыны працуе ў краме).

**Звонкія і глухія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме**

Звонкія і глухія зычныя ўтвараюць наступныя пары: *б* — *п*, *г* — *х*, *дж* — *ч*, *ж* — *ш*, *з* — *с*, *дз* — *ц*. Для праверкі слоў з парнымі звонкімі і глухімі зычнымі на канцы і ў сярэдзіне слова трэба змяніць слова так, каб пасля зычнага стаяў галосны гук (пераход — пераходы, казка — казачка).

# ПАЎТАРЭННЕ

## Праверачная работа 1

*Варыянт 1*

**1.** Прачытай верш М. Пазнякова. Устаў прапушчаныя літары. Падкрэслі націскныя склады.

К__нюшыне каля плоту
Вельмі горача ў сп__коту.
К__нюшыну пак__шу,
Дам ц__лушкам на к__шу.

**2.** Адзнач знакам «+» тыя словы, якія запісаны правільна.

☐ мядаль, ☐ бярэзнік, ☐ метро, ☐ сястра, ☐ таняц, ☐ певень.

**3.** Прачытай. Закрэслі лішнюю літару ў дужках.

Сыноч(*а*, *я*)к, бліскуч(*ы*, *і*), ш(*ю*, *у*)кала, ч(*а*, *я*)шка, ж(*ю*, *у*)равіны, параш(*ю*, *у*)тыст.

**4.** Прачытай. Устаў прапушчаныя літары. Побач запішы праверачныя словы. Падкрэслі літары, якія абазначаюць звонкія зычныя гукі.

Абру__ — ____________________, ду__ — ______________,
пахо__ — ____________________, сця__ — ______________,
дзю__ка — ____________________, маро__ — ______________.

**5.** Перакладзі словы на беларускую мову. Запішы. Вызначы ў іх колькасць літар і гукаў.

Ласточка — ________________ (__ л., __ г.); семена — ________________ (__ л., __ г.); объявление — ________________ (__ л., __ г.).

**2.** Прачытай. Змяні словы па ўзоры.

*Узор: палёт — у палёце.*

Канцэрт — на ____________, чарот — у ___________,
брат — аб ___________, партрэт — на ___________,
хата — у _________, трактарыст — аб ___________.

**3.** Устаў у словы апостраф або раздзяляльны мяккі знак.

Шампін__ён, аб__ёмны, кал__е, парц__ера, узмор__е, пад__ём.

**4.** Падзялі словы для пераносу.

Радзіма — ________________________________;
бярвенне — ______________________________;
Валяр'ян — ______________________________;
шампіньён — _____________________________.

**5.** Адзнач знакам «+» спалучэнні слоў, якія запісаны правільна. Падкрэслі словы, якія нельга пераносіць.

☐ зялёны Дуб, ☐ возера Нарач, ☐ паэт Якуб Колас, ☐ папугай кеша, ☐ драпежны арол, ☐ дзядзька Ігар.

## *Работа над памылкамі*

### *Напісанне слоў з д — дз.*

**1.** Запішы слова правільна. Запішы яшчэ тры словы на гэтае правіла.

*Узор: падзяка, дзень, дзядзька.*

_______________________________________________

_______________________________________________

*Напісанне слоў з т — ц.*

**2.** Запішы слова правільна. Запішы яшчэ тры словы на гэтае правіла.

*Узор: пацеркі, цішыня, напісаць.*

*Раздзяляльныя знакі апостраф (') і мяккі знак (ь).*

**3.** Запішы слова правільна. Запішы яшчэ тры словы на гэтае правіла.

*Узор: вераб'і, паштальён, аб'ява.*

*Падоўжаныя зычныя.*

**4.** Запішы слова правільна. Запішы яшчэ тры словы на гэтае правіла. Раздзялі словы для пераносу.

*Узор: жыл-лё, збож-жа, гал-лё.*

*Перанос слоў.*

**5.** Запішы слова, падзяляючы яго на склады для пераносу. Дапішы яшчэ некалькі прыкладаў.

*Узор: пар-та, баць-ка, ура-джай, зай-шоў, аб'-ява, лаў-ка.*

**4.** Прачытай. Дапоўні сказы галоўнымі і даданымі членамі сказа па пытаннях. Карыстайся словамі для даведкі.

а) Каля (ч а г о?) ______________ была пустка.

б) (К а л і?) ________________ школьнікі пасадзілі на ёй дрэўцы.

в) Кожны дзень дзеці (ш т о р а б і л і?) ______________ іх.

г) Таму (ш т о?) ______________ растуць вельмі добра.

*Словы для даведкі:* дрэўцы, палівалі, школы, вясной.

**5.** Адзнач знакам «+» сказы, у якіх правільна вызначаны галоўныя члены сказа.

☐ Блізка ад вёскі цячэ ручаёк.
☐ Вада булькоча па каменьчыках.
☐ Выцякае ручаёк з крынічкі.
☐ Каля крынічкі растуць парэчкі.

## *Кантрольная работа 1*

*Варыянт 1*

**1.** а) Адзнач знакам «+» клічныя сказы.

☐ Над кветкамі лётаюць матылькі.
☐ Які прыгожы горад Мінск!
☐ Вітаю Вас, Наталля Уладзіміраўна!
☐ Весела ўсміхаецца летні дзень.

б) Адзнач знакам «+» пабуджальныя сказы.

☐ Бягі сюды, Міхаська!
☐ Да мяне прыйшла Марына.
☐ Да мяне прыйшла Ірына?
☐ Хай да мяне прыйдзе Ірына.

**2.** Прачытай верш І. Муравейкі. Пастаў у канцы кожнага сказа патрэбны знак прыпынку. Вызначы тып кожнага сказа па мэце выказвання. Запішы.

— Дзе, чачотка, ты была__ (____________________)
— Я вясной гняздо віла__ (____________________)
— А ў якім скажы бары__ (____________________)
— У тайзе, мае сябры__ (____________________)
— А чаму віла не тут__ (____________________)
— Там гняздоўе, родны кут__ (____________________)

**3.** Прачытай. Дапоўні сказы галоўнымі і даданымі членамі сказа па пытаннях. Карыстайся словамі для даведкі.

Беластволая (ш т о?) ____________________ ўпрыгожвае лес. У кожную пару года дрэўца цешыць вока сваёй (ч ы м?) ____________________. Асабліва прыгожае дрэва (к а л і?) ______________.

*Словы для даведкі:* вясной, бяроза, прыгажосцю.

**4.** Складзі і запішы сказы з прапанаваных слоў.

| | | |
|---|---|---|
| Вясна | прыгожыя | свеціць |
| сонейка | цёплая | расцвілі |
| кветкі | ласкавае | наступіла |

________________________________________

________________________________________

**5.** Прачытай. Падкрэслі ў кожным сказе дзейнік і выказнік.

Ноч стаяла ціхая і духмяная. Адспявалі ўжо салаўі. Яшчэ не прачнуліся раннія птушкі. Адзінокія зоркі віселі над зямлёй. (*Паводле І. Шамякіна.*)

*Варыянт 2*

**1.** а) Адзнач знакам «+» клічныя сказы.

☐ Ты прачытаў ужо гэтую кнігу?
☐ Віншую цябе, Януля, з днём нараджэння!
☐ Я так люблю сваю Беларусь!
☐ Дачушка, прынясі мне, калі ласка, часопіс.

# АДКАЗЫ

## *ПАЎТАРЭННЕ*

Праверачная работа 1

Праверачная работа 2

## *ТЭКСТ*

Праверачная работа 1

## *СКАЗ*

Праверачная работа 1

Кантрольная работа 1

# ЗМЕСТ


**Прадмова** .................... 3

**Паўтарэнне**

Праверачная работа 1 ..... 6
*Варыянт 1* ................ 6
*Варыянт 2* ................ 7
Работа над памылкамі .... 8
Праверачная работа 2 ..... 11
*Варыянт 1* ................ 11
*Варыянт 2* ................ 11
Работа над памылкамі .... 12

**Тэкст**

Праверачная работа 1 ..... 14
*Варыянт 1* ................ 14
*Варыянт 2* ................ 16

**Сказ**

Праверачная работа 1 ..... 20
*Варыянт 1* ................ 20
*Варыянт 2* ................ 21
Кантрольная работа 1 ..... 22
*Варыянт 1* ................ 22
*Варыянт 2* ................ 23

**Слова**

Праверачная работа 1 ..... 25
*Варыянт 1* ................ 25
*Варыянт 2* ................ 26
Праверачная работа 2 ..... 27
*Варыянт 1* ................ 27
*Варыянт 2* ................ 28
Праверачная работа 3 ..... 30
*Варыянт 1* ................ 30
*Варыянт 2* ................ 30
Работа над памылкамі .... 31
Праверачная работа 4 ..... 32
*Варыянт 1* ................ 32
*Варыянт 2* ................ 33
Кантрольная работа 1 ..... 34
*Варыянт 1* ................ 34
*Варыянт 2* ................ 34

**Часціны мовы**

Праверачная работа 1 ..... 36
*Варыянт 1* ................ 36
*Варыянт 2* ................ 37
Праверачная работа 2 ..... 39
*Варыянт 1* ................ 39
*Варыянт 2* ................ 39
Праверачная работа 3 ..... 41
*Варыянт 1* ................ 41
*Варыянт 2* ................ 42
Праверачная работа 4 ..... 43
*Варыянт 1* ................ 43
*Варыянт 2* ................ 44
Работа над памылкамі .... 45
Кантрольная работа 1 ..... 45
*Варыянт 1* ................ 45
*Варыянт 2* ................ 46

**Адказы** ......................... 48